*УДК 340.1(091)*

# УПЛЫЎ ПАЛІТЫКА-ПРАВАВЫХ ІДЭЙ АЙЧЫННЫХ АСВЕТНІКАЎ НА СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў XII–XVIII стст.

***Л. Л. ГОЛУБЕВА***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Паказваецца ўплыў палітыка-прававых ідэй айчынных асветнікаў на фарміраванне дзяржаўных органаў улады, права, палітыкі, заканадаўства ў розныя перыяды станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці з XII па XVIII ст. Падкрэсліваецца, што беларускія асветнікі ў працах змястоўна адлюстроўвалі найбольш істотныя сацыяльныя і палітычныя праблемы эпохі і сучаснага ім грамадства, выступалі за стварэнне самастойнай дзяржавы і падтрыманне яе незалежнасці як галоўнай палітычнай каштоўнасці, уздымалі праблему ўдасканалення дзяржаўных, прававых інстытутаў, а таксама адзначалі неабходнасць захавання і вывучэння гістарычнай спадчыны беларускага народа з мэтай недапушчэння памылак у будучым.

***Ключавыя словы***: беларуская дзяржаўнасць; палітыка-прававыя ідэі; станаўленне і развіццё; айчынныя асветнікі; палітыка; права; заканадаўства.

# ВЛИЯНИЕ ПОЛИТИКО-ПРАВОВЫХ ИДЕЙ ОТЕЧЕСТВЕННЫХ ПРОСВЕТИТЕЛЕЙ НА СТАНОВЛЕНИЕ И РАЗВИТИЕ БЕЛОРУССКОЙ ГОСУДАРСТВЕННОСТИ В XII–XVIII вв.

***Л. Л. ГОЛУБЕВА***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Показывается влияние политико-правовых идей отечественных просветителей на формирование государственных органов власти, права, политики, законодательства в разные периоды становления и развития белорусской государственности с XII по XVIII в. Подчеркивается, что белорусские просветители в работах содержательно отражали наиболее существенные социальные и политические проблемы эпохи и современного им общества, выступали за создание самостоятельного государства и поддержание его независимости как главной политической ценности, поднимали проблему усовершенствования государственных, правовых институтов, а также отмечали необходимость сохранения и изучения исторического наследия белорусского народа с целью недопущения ошибок в будущем.

***Ключевые слова:*** белорусская государственность; политико-правовые идеи; становление и развитие; отечественные просветители; политика; право; законодательство.

**Образец цитирования:**
Голубева ЛЛ. Уплыў палітыка-прававых ідэй айчынных асветнікаў на станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці ў XII–XVIII стст. *Журнал Белорусского государственного университета. Право.* 2023;3:10–21.
EDN: DDKTLN

**For citation:**
Golubeva LL. The influence of political and legal ideas of national educators on the establishment and development of the Belarusian statehood in the 12th – 18th centuries. *Journal of the Belarusian State University. Law.* 2023;3:10–21. Belarusian.
EDN: DDKTLN

**Автор:**
***Людмила Леонидовна Голубева*** – кандидат юридических наук, доцент; заведующий кафедрой теории и истории государства и права юридического факультета.

**Author:**
***Ludmila L. Golubeva***, PhD (law), docent; head of the department of theory and history of the state and law, faculty of law.
*golubevall@bsu.by*

# THE INFLUENCE OF POLITICAL AND LEGAL IDEAS OF NATIONAL EDUCATORS ON THE ESTABLISHMENT AND DEVELOPMENT OF THE BELARUSIAN STATEHOOD IN THE 12$^{th}$ – 18$^{th}$ CENTURIES

***L. L. GOLUBEVA***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliezhnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The author shows the influence of political and legal ideas of national educators on the establishment and development of state bodies of power, law, politics, and legislation in various periods of the establishment and development of Belarusian statehood from the 12$^{th}$ to the 18$^{th}$ century. It is noted that Belarusian educators in their works meaningfully reflected the most significant social and political problems of the era of their modern society, advocated the creation of an independent state, for the preservation of its independence as the main political value, raised the issue of improving state and legal institutions, noted the need to preserve and study the historical heritage of the Belarusian people in order to avoid mistakes in the future.

***Keywords:*** Belarusian statehood; political and legal ideas; establishment and development; national educators; politics; law; legislation.

## Уводзіны

У прэамбуле Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь агаворыцца аб шматвяковай гісторыі развіцця беларускай дзяржаўнасці, культурных і духоўных традыцыях. На наш погляд, гэта пераемнасць з'яўляецца добрым прыкладам узаемасувязі гісторыі і сучаснасці[1]. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь у штогадовым Пасланні беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу 31 сакавіка 2023 г. адзначыў, што аднымі з умоў суверэнітэту і незалежнасці краіны выступаюць гістарычная памяць і нацыянальныя традыцыі[2].

На аснове гэтага айчынныя навукоўцы ў кантэксце нацыянальна-дзяржаўнага падыходу, у адпаведнасці з якім вывучэнне гісторыі станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці з'яўляецца прыярытэтным кірункам даследаванняў, пачалі актыўна друкаваць працы па нацыянальнай гісторыі дзяржавы і права, ліквідуючы значныя прабелы ў ёй. Існуюць шмат публікацый, у якіх разглядаюцца дзяржаўныя, прававыя інстытуты, а таксама палітыка-прававыя погляды айчынных асветнікаў на палітыку, права, заканадаўства на розных этапах станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці. Аднак, на жаль, прац, у якіх прааналізаваны ўплыў палітыка-прававых поглядаў айчынных асветнікаў на асноўныя дзяржаўныя і прававыя інстытуты, практычна няма. У сувязі з гэтым аўтар дадзенага артыкула ставіць мэту выявіць уплыў палітыка-прававых ідэй айчынных асветнікаў на станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці ў XII–XVIII стст.

## Асноўная частка

Беларуская дзяржаўнасць, якая ўзнікла ў далёкай старажытнасці пад уздзеяннем шматлікіх унутраных і знешніх сацыяльна-эканамічных і палітычных прычын, у сваім станаўленні і развіцці прайшла доўгі і складаны гістарычны шлях.

Вялікі ўплыў на станаўленне і развіццё дзяржаўных органаў улады, права, палітыкі і заканадаўства аказалі ідэі, якія выказваліся нацыянальнымі мысліцелямі, рэлігійнымі, дзяржаўнымі дзеячамі, палітыкамі і правазнаўцамі са старажытных часоў да сённяшняга дня.

Гэтыя ідэі адлюстраваны ў шматлікіх па колькасці і разнастайных па форме выкладання першакрыніцах: жыційнай літаратуры (Жыціі Ефрасінні Полацкай, Жыціі Кірылы Тураўскага, Жыціі Аўрамія Смаленскага), летапісах, у тым ліку старажытнарускіх (Аповесці мінулых гадоў, Слове аб паходзе Ігаравым) і беларуска-літоўскіх (Летапісе вялікіх князёў літоўскіх, Беларуска-літоўскім летапісе 1446, Хроніцы Быхаўца), палітычных памфлетах (сачыненнях) (аповесці-прытчы Кірылы Тураўскага аб чалавечай душы і целе (аб кульгавым і сляпым)), пасланнях (творы Клімента Смаляціча «Пасланне смаленскаму прэсвітэру Фаме»), прадмовах або ўступных артыкулах да перакладзеных дзеячамі кніг (прадмове Ф. Скарыны да Біблії), творах рэлігійна-палемічнай (тэкстах Пятра Скаргі «Пра еднасць Божай царквы», Іпація Пацея «Унія...», Хрыстафора Філалета «Апакрысіс», Мялецція

[1]Конституция Республики Беларусь // Офиц. интернет-портал Президента Респ. Беларусь. URL: https://president.gov.by/ru/gosudarstvo/constitution (дата обращения: 27.09.2023).
[2]Послание белорусскому народу и Национальному собранию // Там же. URL: https://president.gov.by/ru/events/poslanie-aleksandra-lukashenko-belorusskomu-narodu-i-nacionalnomu-sobraniyu-sostoitsya-31-marta (дата обращения: 10.11.2023).

Сматрыцкага «Трэнас», Афанасія Філіповіча «Дыярыуш») і мастацкай (паэтычным зборніку Сімяона Полацкага «Вертаград мнагацветны») літаратуры, эпісталярнай спадчыне (лісце Л. І. Сапегі да епіскапа І. Кунцэвіча), палітычных трактатах і філасофскіх сачыненнях (працах А. Волана «Пра гасудара і ўласцівыя яму дабрачыннасці», А. Алізароўскага «Аб палітычнай супольнасці людзей») і інш. Яны таксама ўвасоблены ў нарматыўных прававых актах: агульнадзяржаўных (агульназемскіх), абласных, валасных і гарадскіх граматах Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ), статутах ВКЛ 1529, 1566, 1588 гг. і інш.

У IX–XII стст. (перыяд старажытных беларускіх дзяржаў) самым магутным было Полацкае княства. Як адзначаюць навукоўцы, гэта дзяржава знаходзілася на шляху фарміравання сярэдневяковай вечавай рэспублікі, у якой княжацкая ўлада не страціла сваёй сілы, як гэта атрымалася ў Ноўгарадзе, а веча не перастала існаваць, як у Паўночна-Усходняй Русі [1, с. 25]. Полацкі кіраўнік лічыўся главой усёй зямлі і ў той перыяд, калі мясцовыя князі сталі гасударамі асобных земель, напрыклад Мінскага, Віцебскага і іншых княстваў. Вечавыя сходы Полацкай старажытнай дзяржавы заклалі традыцыі народаўладдзя.

Як адзначыла старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Н. І. Качанава на выязным семінары на тэму «Рэспубліка Беларусь: ад вытокаў да сучаснасці (гістарычны шлях дзяржаўнага будаўніцтва)», што адбыўся 25 студзеня 2023 г. у Мінску, «…нашы карані вельмі старажытныя. Першая дзяржава – Полацкае княства – узнікла яшчэ ў дзясятым стагоддзі. Гэта святая зямля – калыска беларускай дзяржаўнасці. Полацк быў адным з трох ключавых цэнтраў Старажытнай Русі нараўне з Ноўгарадам, Кіевам і заўсёды адрозніваўся самастойнасцю»[3].

Веча ўзнікла адначасова з дзяржавай і існавала ва ўсіх старажытных княствах. На ім большасцю галасоў вырашаліся найбольш важныя пытанні. З летапісаў вядома, што веча актыўна дзейнічала ў Полацкім княстве, а таксама ў іншых старажытных беларускіх землях, напрыклад у Тураўскім княстве, дзе нават мелася пасада пасадніка, які выконваў функцыі намесніка князя.

Умацаванню старажытных дзяржаў садзейнічала ўвядзенне хрысціянства, што кардынальна змяніла менталітэт народа. Паступова з'явілася кола асоб, якія займаліся непасрэдна вырашэннем тэарэтычных і практычных праблем належнага функцыянавання дзяржавы і ігралі важную ролю ў працэсе ўмацавання пазіцый хрысціянскай ідэалогіі і міжнароднага аўтарытэту старажытных беларускіх дзяржаў-княстваў.

Так, айчынныя беларускія мысліцелі Ефрасіння Полацкая (не пазней 1104 – 1167 гг.), Кірыла Тураўскі (каля 1113 – пасля 1190 гг.), Клімент Смаляціч (? – пасля 1164 г.) на першае месца ставілі ідэю служэння Богу і вышэйшым духоўным каштоўнасцям, адмаўляліся ад матэрыяльных даброт, акцэнтавалі ўвагу на духоўным, вечным пачатку. Ефрасіння Полацкая лічыла, што ў яе няма нічога, акрамя слова Божага і кніг. Перапісванне і распаўсюджванне кніг – адны з найважнейшых богаўгодных місій чалавека. У гэтым заключаўся сэнс дзейнасці Еўфрасінні Полацкай. Пры манастырах адкрываліся школы, дзе вывучаліся асновы хрысціянскай рэлігіі, розныя навукі, у тым ліку гісторыя. Прычым вывучалася не толькі гісторыя Полацкай зямлі, але і ўся славянская і нават сусветная гісторыя. Галоўнай мэтай была папулярызацыя ідэй хрысціянскага, мірнага суіснавання людзей, народаў і дзяржаў. Навукоўцы сцвярджаюць, што Ефрасіння Полацкая мела значны ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё як Полацкага княства, так і іншых дзяржаў[4].

Кірыла Тураўскі стараўся спасцігнуць вучэнне Божых кніг. У сваіх творах ён адлюстроўваў падзеі сацыяльнага, палітычнага і царкоўнага жыцця. Прыкладам яго дзейнасці выступае аповесць-прытча аб чалавечай душы і целе (аб кульгавым і сляпым), накіраваная супраць негатыўных з'яў тагачаснага грамадства. Мараль прытчы заключаецца ў тым, што толькі не парушаючы законаў (пісаных і не пісаных), а таксама маральных запаветаў можна дасягнуць дасканалай супольнасці людзей[5].

Клімент Смаляціч адмаўляўся ад матэрыяльных даброт, уключаючы царкоўную маёмасць, у той час як многія манастыры, цэрквы, асобныя свяшчэннаслужыцелі з'яўляліся буйнымі ўласнікамі. Ён рабіў акцэнт на духоўным, вечным пачатку[6].

Такім чынам, вытокі айчыннай дзяржаўнасці, несумненна, знаходзяцца ў далёкай старажытнасці. Першымі гістарычнымі формамі беларускай дзяржаўнасці былі Полацкае і Тураўскае княствы, на станаўленне і развіццё якіх значны ўплыў аказалі ідэі і дзейнасць беларускіх асветнікаў XI–XII стст. Яны адлюстроўвалі сацыяльныя і палітычныя праблемы тагачаснага грамадства, у першую чаргу імкненне беларускай народнасці, якая толькі фармі-

---

[3]Вступительное слово Председателя Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь Н. И. Кочановой на выездном семинаре Совета Республики на тему «Республика Беларусь: от истоков до современности (исторический путь государственного строительства) // Совет Респ. Нац. собр. Респ. Беларусь : сайт. URL: https://sovrep.gov.by/ru/interview-ru/view/vstupitelnoe-slovo-predsedatelja-soveta-respubliki-natsionalnogo-sobranija-respubliki-belarus-kochanovoj-ni-1634 (дата обращения: 10.11.2023).

[4]Ефрасіння Полацкая // Асветнікі зямлі Беларускай, X – пачатак XX ст. : энцыкл. давед. / пад рэд. Г. П. Пашкова. Мінск : Беларус. энцыкл., 2001. С. 160–162.

[5]Кірыла Тураўскі // Там жа. С. 230–234.

[6]Клімент Смаляціч // Там жа. С. 236–238.

равалася, да стварэння самастойнай і незалежнай дзяржавы.

Наступны перыяд у станаўленні і развіцці айчыннай дзяржаўнасці звязаны з ВКЛ, палітыка-эканамічным цэнтрам якога былі беларускія землі. Менавіта ў гэты час сфарміравалася кола палітычных дзеячаў і мысліцеляў новага ўзроўню (Францыск Скарына (каля 1490 – каля 1551 гг.), Міхалон Літвін, Сымон Будны (каля 1530 – 1593 гг.), Андрэй Волан (пасля 1530 – 1610 гг.), Астафій Валовіч (каля 1520 – 1587 гг.), Леў Сапега (1557–1633)), якія не толькі распрацоўвалі тэарэтычныя пытанні дзяржавы і права, але і на аснове абагульнення міравых дасягненняў уносілі практычныя прапановы па ўдасканаленню грамадскіх адносін, а таксама заканадаўства.

Пачынальнікам айчыннага рэнесансавага асветніцтва быў Ф. Скарына – усходнеславянскі, у прыватнасці беларускі, першадрукар, выдавец і каментатар першай беларускай Біблії[7]. Вялікую ўвагу ў сваёй творчай дзейнасці асветнік надаваў пытанням палітыкі і права. Так, ён лічыў, што палітычным ідэалам з'яўляецца асветная, гуманная, моцная манархія. На думку Ф. Скарыны, манарх павінен быць набожным, мудрым, адукаваным, чулым і справядлівым да сваіх падданых. Ён абавязаны кіраваць дзяржавай у строгай адпаведнасці з законамі, сачыць за належным ажыццяўленнем правасуддзя. Адначасова кіраўніку дзяржавы трэба быць моцным і грозным, умець у неабходным выпадку абараніць свой народ. Аднак Ф. Скарына аддаваў перавагу адукаванаму і міралюбіваму гаспадару. Асветнік быў упэўнены ў тым, што грамадства павінна грунтавацца на міры і згодзе.

У прадмове да кнігі «Другі закон Маісееў» Ф. Скарына прапанаваў класіфікацыю права. На яго думку, права дзеліцца на натуральнае і пісанае. Натуральнае права закладзена ў самой істоце чалавека, яно з'яўляецца аднолькавым для ўсіх людзей, уласцівым кожнаму чалавеку і не залежыць ад месца і часу. Пісанае права Ф. Скарына падзяляў на Божае, царкоўнае (кананічнае) і земскае. Нормы Божага права змешчаны ў кнігах Старога Запавету і Новага Запавету (Бібліі). Асветнік адзначаў, што ў Бібліі пералічаны ўсе законы і правы, якімі людзі павінны кіравацца на зямлі. Гэтыя нормы выступаюць сінонімамі волі Бога. Таму заслугоўвае асуджэння не толькі той, хто не падпарадкоўваецца волі Бога, але і той, хто не ведае яе прадпісанняў. Царкоўнае права – гэта пастановы (каноны), прынятыя царкоўнай уладай. У земскім праве ў залежнасці ад грамадскіх адносін, што рэгуляваліся пэўнымі нормамі, Ф. Скарына вылучаў паспалітае (нормы грамадзянскага і сямейнага права), міжнароднае, дзяржаўнае, крымінальнае, ваеннае, гарадское, марское і гандлёвае права.

Супастаўленне прававых ідэй Ф. Скарыны са зместам Статута Вялікага Княства Літоўскага 1529 г. дазволіла прафесару І. А. Юхо прыйсці да высновы аб тым, што асветнік удзельнічаў у распрацоўцы першага сістэматызаванага зводу законаў [2]. На нашу думку, прапанаваная Ф. Скарынам класіфікацыя права, а менавіта вылучэнне ў земскім праве розных галін права, была выкарыстана пры падрыхтоўцы Статута Вялікага Княства Літоўскага 1529 г.

Ф. Скарына лічыў, што пісаны закон павінен быць годным для выканання і карысным для насельніцтва, а таксама адпавядаць звычаям, часу і месцу. Асветнік выказваўся і па адным з найбольш важных пытанняў крымінальнага права – аб мэтах крымінальнага пакарання, пад якімі ён разумеў застрашванне злачынца і адначасова папярэджанне іншым асобам, здольным да злачынства.

Акрамя таго, Ф. Скарына прытрымліваўся ідэі вяршэнства народа ў праватворчасці. Асветнік з'яўляўся прыхільнікам ідэі міру паміж народамі (вечнага міру). Ён быў не толькі вучоным-прававедам, але і юрыстам-практыкам, таму неаднаразова выступаў у судах у якасці абаронцы асабістых інтарэсаў, а таксама інтарэсаў сваіх блізкіх (брата Івана і жонкі Маргарыты).

Працэс удасканалення дзяржаўных, прававых інстытутаў адлюстроўваўся ў працах айчынных мысліцеляў, якія адзначалі неабходнасць захавання і вывучэння гістарычнай спадчыны беларускага народа.

Так, вядомы айчынны гуманіст і мысліцель XVI ст. Міхалон Літвін у сацыяльна-палітычным трактаце «Аб норавах татараў, літоўцаў і масквіцян» (каля 1550 г.) параўноўваў норавы, звычаі, традыцыі, законы, асаблівасці арганізацыі кіравання і судовай улады ў розных дзяржавах[8]. Моцную дзяржаўнасць ён звязваў з разумнасцю законаў, мараллю штодзённага жыцця грамадства, стабільнасцю сям'і. Асветнік адлюстраваў погляды тых, хто ў сваёй дзейнасці кіраваўся нацыянальнымі інтарэсамі ВКЛ.

У трактаце Міхалон Літвін узняў пытанні сацыяльна-палітычнага ўдасканалення грамадства, рэфармавання існуючых грамадскіх інстытутаў. Ён бачыў аснову гарманічнага грамадства ў маёмаснай роўнасці, прытрымліваўся канцэпцыі ідэальнага правіцеля, справядлівага кіравання і правасуддзя. Грамадскія праблемы асветнік разглядаў з пазіцый процiпастаўлення дрэнных і добрых звычаяў, аддаваў перавагу самаабмежаванню і памяркоўнасці. Акрамя таго, ён выступаў супраць заняволення адных людзей другімі.

Міхалон Літвін закрануў праблему сацыяльнай роўнасці перад законам. На яго думку, павінен быць аднолькавы прынцып абкладання падаткамі простага чалавека і шляхціца: чым большая маёмасць, тым большым будзе падатак.

[7]Францыск Скарына і яго час : энцыкл. давед. / пад рэд. І. П. Шамякіна. Мінск : Беларус. сав. энцыкл., 1988. 607 [1] с.
[8]Извлечение из четвертого фрагмента // Белорус. мыслители XVI–XVII вв. Избр. тр. Минск : Редакция журнала «Промышленно-торговое право», 2017. С. 205–211.

Шмат месца ў трактаце адведзена пытанням удасканалення правасуддзя. Асноўнае з іх – ахова жыцця простага чалавека. Прынцып «кроў за кроў» павінен быць аднолькавым для ўсіх злачынцаў незалежна ад іх сацыяльнага становішча. Таму Міхалон Літвін лічыў неабходным вызваліць працоўнае насельніцтва з-пад юрысдыкцыі феадалаў, а права на вынясенне смяротнай кары дазволіць толькі вышэйшым судам. Ён прапаноўваў увесці агульнасаслоўныя суды. У чацвёртым раздзеле трактата Міхалон Літвін вылучыў недахопы судовай сістэмы: адсутнасць апеляцыйных судоў, галоснасці, норм судовай пісьменнасці, хібы ў паказаннях сведак. Асветнік падкрэсліваў, што непадзельнасць судовай і адміністрацыйнай улады, сумяшчэнне адной асобай некалькіх адміністрацыйных пасад вядуць да страты ідэі справядлівасці і незалежнасці суда.

Праблемы, узнятыя Міхалонам Літвінам у трактаце, часткова былі вырашаны падчас правядзення судовай рэформы 1564 г.: удасканалены дзяржаўнае кіраванне, правасуддзе і працэдура судовага разбору, створана апеляцыйная судовая інстанцыя – Трыбунал Вялікага Княства Літоўскага, падрыхтаваны кваліфікаваныя ўраднікі дзяржаўнага кіравання і суда.

У другой чвэрці XVI ст. на беларускіх землях пачынаюць распаўсюджвацца ідэі Рэфармацыі. Рэфармацыйны рух праявіўся ў ВКЛ пераважна ў формах лютэранства, кальвінізму, арыянства. Лютэранскія ідэі, якія прапаведаваў айчынны асветнік А. Кульва (каля 1510 – 1545 гг.), не атрымалі значнага распаўсюджвання на беларускіх землях. Найбольшае пашырэнне сярод прыхільнікаў Рэфармацыі атрымаў кальвінізм з яго рэспубліканскімі і дэмакратычнымі ідэямі. Вядомымі кальвіністамі ў ВКЛ былі М. Радзівіл Чорны (1515–1565), А. Б. Валовіч, А. Волан [3, с. 76–80].

М. Радзівіл Чорны з’явіўся галоўным ініцыятарам папулярызацыі кальвінізму ў ВКЛ. Па яго ініцыятыве будаваліся кальвініцкія храмы, пры якіх адчыняліся кальвініцкія школы, а таксама ствараліся кальвініцкія абшчыны, засноўваліся друкарні. Першая друкарня на тэрыторыі сучаснай Беларусі была адкрыта ў Брэсце ў 1553 г. Да кальвініцкіх ідэй далучыліся сваякі і аднадумцы М. Радзівіла Чорнага (Вішнявецкія, Сапегі, Валовічы), якія будавалі ў сваіх уладаннях кальвініцкія храмы. Каля 1560 г. кальвініцкі рух на тэрыторыі Беларусі аформіўся ў стройную арганізацыю, заснаваную на дэмакратычных прынцыпах.

Асветнік разглядаў кальвінізм як тэарэтычную аснову рэфармавання дзяржаўнага ладу ВКЛ. Ён выступаў супраць канцэнтрацыі абсалютнай свецкай улады ў руках манарха, быў прыхільнікам перанясення рэспубліканскіх і дэмакратычных прынцыпаў кальвініцкіх абшчын на дзяржаву. Крыніцай рэлігійнай ісціны ён лічыў Свяшчэннае Пісанне.

Акрамя таго, М. Радзівіл Чорны быў прыхільнікам незалежнасці ВКЛ. Ён разглядаў кальвінізм як сродак, які дазволіць аслабіць польскі ўплыў на беларускія землі.

Вялікую ролю ў распаўсюджванні кальвінізму ў ВКЛ адыграў А. Б. Валовіч. Пры яго падтрымцы будаваліся кальвініцкія храмы, запрашаліся прапаведнікі, засноўваліся друкарні, выдавалася кальвініцкая літаратура.

Палітычны дзеяч, філосаф і правазнаўца А. Волан у працах «Пра палітычную або грамадзянскую свабоду», «Прамовы да сената…», «Пра шчаслівае жыццё, або Найвышэйшае чалавечае дабро», «Пра гасудара і ўласцівыя яму дабрачыннасці» выступаў за рэформы ў сацыяльных і палітычных адносінах, праве і дзяржаўным кіраванні, распрацоўваў канцэпцыю свабоды чалавека, разглядаў дабрачыннасці, якімі павінен валодаць сапраўдны кіраўнік дзяржавы. Ён прытрымліваўся тэорыі натуральнага права і выкарыстоўваў для яе характарыстыкі наступны першахрысціянскі маральны прынцып: «І гэтак ва ўсім, як хочаце, каб з вамі абыходзіліся людзі, так і вы абыходзьцеся з імі» (цыт. па [6, с. 34–38]).

У сярэдзіне 1560-х гг., каля 1563–1565 гг., у кальвініцкім руху адбыўся раскол [5, с. 182]. З шэрагаў кальвіністаў вылучыўся больш радыкальны напрамак пратэстантызму, прыхільнікі якога атрымалі адразу некалькі назваў: арыяне, антытрынітарыі, сацыніяне, унітарыі (унітарыяне). Арыяне актыўна абмяркоўвалі дзве групы грамадска-палітычных праблем.

Першая група праблем была звязана з адносінамі да ўласнасці. Арыяне шырока абмяркоўвалі пытанні аб тым, ці можа арыянская шляхта валодаць маёнткамі (вялікай маёмасцю наогул), мець прыгонных сялян, карыстацца вынікамі іх працы, устанаўліваць для сваіх прыгонных паншчыну і г. д. Другая група праблем датычылася адносін да дзяржавы. Прыхільнікі арыянства абмяркоўвалі пытанні характару дзяржаўных інстытутаў, стаўлення веруючых да іх, асабістых праў і грамадзянскіх абавязкаў, а таксама аддзялення свецкай улады ад царкоўнай і інш.

У залежнасці ад адказаў на гэтыя пытанні ў арыянстве вылучыліся два напрамкі. Першы, памяркоўны (або правы), напрамак адлюстроўваў погляды сярэдняй шляхты і заможных гараджан. Яго ідэолагамі былі Я. С. Кішка (каля 1540 – 1592 гг.), С. Будны, В. М. Цяпінскі (1530-я гг. – 1599 або 1600 г.) і інш. Яны лічылі, што арыянская шляхта можа валодаць маёнткамі, мець прыгонных сялян, карыстацца вынікамі іх працы, толькі адносіны паміж імі не павінны выходзіць за рамкі хрысціянскай маралі. Сапраўднаму арыяніну трэба плаціць падаткі, займаць дзяржаўныя пасады, выконваць воінскі абавязак і нават прымаць удзел у вайне, калі яна носіць справядлівы (абарончы) характар.

Найбольш вядомым тэарэтыкам гэтай плыні арыянства з’яўляўся С. Будны. Спачатку ён прытрымліваўся кальвініцкіх поглядаў. У 1562 г. у Нясвіжскай

друкарні выйшла ў свет выданне «Катэхізіс», перакладзенае С. Будным на беларускую мову. Да яго асветнік напісаў прадмову, у якой асуджаў амаралізм і невуцтва каталіцкіх святароў, а таксама распрацаваў вучэнне аб войнах. Справядлівымі С. Будны прызнаваў войны, якія вядуцца дзеля абароны Айчыны. Сапраўдны арыянін павінен прымаць удзел у такой вайне. Несправядлівыя войны С. Будны называў разбоем і лічыў, што не ўдзельнічаць у іх – абавязак кожнага сумленнага чалавека.

У сярэдзіне 1560-х гг. С. Будны перайшоў на пазіцыі правай плыні арыянства, дзе хутка вылучыўся як яе лідар [6, с. 99]. Палітычным ідэалам С. Буднага з'яўлялася манархія. Ён разважаў пра асобу ідэальнага манарха – богабаязнага, справядлівага, міласэрнага. Такі чалавек павінен акружыць сябе разумнымі і вучонымі людзьмі, якія добра ведаюць законы, выкарыстоўваць уладу не ў асабістых мэтах, а на карысць усёй дзяржавы дзеля дасягнення магчыма лепшага жыцця. С. Будны быў прыхільнікам цэнтралізаванай дзяржавы, якая выступае гарантам абароны праў асобы.

У 1583 г. была выдадзена галоўная праца жыцця С. Буднага «Пра свецкую ўладу». У ёй асветнік выказаў адносіны да сучасных яму дзяржавы і дзяржаўных інстытутаў, воінскага абавязку шляхты, прыватнай уласнасці, права ўладання прыгоннымі сялянамі. Ён не быў праціўнікам прыватнай уласнасці і лічыў, што арыянская шляхта можа валодаць маёнткамі, мець прыгонных сялян, таму што гэта не супярэчыць хрысціянскаму веравучэнню. С. Будны асуджаў толькі крайнасці феадальнага ладу, найбольш жорсткія праявы прыгонніцтва. У залежнасці ад валодання маёмасцю ён прызнаваў саслоўнае дзяленне сучаснага яму грамадства. Асветнік выказваўся за суіснаванне і супрацоўніцтва розных сацыяльных саслоўяў, роўнасць саслоўяў перад законам.

На думку С. Буднага, дзяржаўная ўлада мае Божае паходжанне і ёй неабходна падпарадкоўвацца. Сілай дамагацца ўлады нельга. Таму сапраўдны арыянін можа займаць любыя дзяржаўныя пасады, звяртацца ў суд, весці судовыя працэсы і нават выконваць абавязкі суддзі, які павінен быць справядлівым, чэсным, праўдзівым і веруючым, не перакручваць законы, не браць хабараў.

Такія ж погляды на дзяржаву і ўласнасць былі ў В. М. Цяпінскага. У 1580 г. ён выдаў Евангелле на беларускай мове. У прадмове да яго асветнік падвергнуў крытыцы духавенства, якое не клапацілася аб адкрыцці беларускамоўных школ для простых людзей. Акрамя таго, В. М. Цяпінскі развіў сфармуляваную Ф. Скарынам і С. Будным ідэю адзінства і дружбы славянскіх народаў.

Прадстаўнікі другога напрамку арыянства, радыкальнага (або левага), адлюстроўвалі погляды гарадской і вясковай беднаты. Яго ідэолагамі былі Пётр з Ганёндза (паміж 1525–1530 гг. – 1573 г.), Марцін Чаховіц (1532–1613), Лаўрэнцій Крышкоўскі, Якуб з Калінаўкі (?–1583), Павел з Візны.

Пётр з Ганёндза ў працах «Супраць боскасці Ісуса Хрыста» (1557) і «Аб першахрысціянскай царкве» (1564) выступіў супраць прыватнай уласнасці, сацыяльнай няроўнасці, прыгоннага права, свецкай улады сучаснай яму дзяржавы, а таксама супраць войнаў, смяротнага пакарання. Ён адмаўляў дзяржаўную ўладу і дзяржаўныя пасады.

М. Чаховіц крытыкаваў каталіцкае веравучэнне і каталіцкую царкву, адмаўляў феадальную ўласнасць і дзяржаву з усімі яе атрыбутамі, прыгонніцтва, войны, прапанаваў ураўняльныя прынцыпы жыцця першых хрысціянскіх абшчын, патрабаваў рэлігійнай верацярпімасці.

Л. Крышкоўскі быў супраць прыватнай уласнасці, якую лічыў прычынай усіх сацыяльных бед, а таксама супраць сучаснай яму дзяржавы як апарату прымуса. У рэзкай форме ён асуджаў прыгонніцтва, паразітызм каталіцкага духавенства і выступаў супраць войнаў.

Такім чынам, Рэфармацыя на беларускіх землях у цэлым была прагрэсіўнай з'явай. Яна паслабіла палітычныя і эканамічныя пазіцыі каталіцкай царквы ў грамадстве, садзейнічала передавому развіццю палітычных, прававых і заканадаўчых ідэй, беларускай мовы, зразумелай простаму насельніцтву, нацыянальнай культуры, абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці народа, яго самавызначэнню.

Вялікую ролю ў станаўленні і развіцці беларускай дзяржаўнасці адыгралі ідэі знакамітага беларускага дзяржаўнага дзеяча, мысліцеля, заканатворцы, суддзі Л. І. Сапегі. У прадмовах да Статута Вялікага Княства Літоўскага 1588 г., а менавіта ў прысвячэнні вялікаму князю ВКЛ і каралю польскаму Жыгімонту III Вазе і ў звароце да ўсіх саслоўяў (грамадзян), асветнік выклаў канцэпцыю прававой дзяржавы[9]. Ён меркаваў, што дзяржава ўзнікла натуральным шляхам і была прызначана для дасягнення магчыма лепшага жыцця. Яна засноўваецца на прынцыпах унутранага адзінства, цэнтралізму, правапарадку і законнасці. Галоўнай катэгорыяй філасофіі права Л. І. Сапега лічыў катэгорыю свабоды. Зварот да ўсіх саслоўяў ВКЛ Л. І. Сапега пачаў наступнымі словамі: «Мудрацы ўсіх вякоў лічылі, што ў кожнай дзяржаве прыстойнаму чалавеку нічога не можа быць даражэй за свабоду»[10]. Сутнасць свабоды, на думку асветніка, складаюць неадчужальныя правы чалавека – права на ўласнасць і права на асабістую недатыкальнасць. Для абароны грамадзянскіх свабод існуе права, якое Л. І. Сапега разглядаў як сапраўднае праяўленне розуму чалавека. Права павінна забяспечыць унутраны

[9]Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. : тэксты, давед., камент. / пад рэд. І. П. Шамякіна. Мінск : Беларус. сав. энцыкл. 1989. 573 с.

[10]Там жа. С. 47.

парадак, стабільнае і ўстойлівае развіццё дзяржавы, сацыяльны мір. Жыццё ў адпаведнасці з законамі – абавязковая ўмова функцыянавання дзяржавы. Толькі павага да права дае магчымасць быць сапраўды свабоднымі. Кожны чалавек павінен ведаць межы сваёй свабоды, а для гэтага неабходна вывучаць законы. Закон павінен быць аднолькавым і абавязковым для ўсіх саслоўяў. Неабходна, каб ён быў накіраваны супраць асобных правапарушальнікаў. Калі ў грамадстве адсутнічае павага да права і пануе беззаконнасць, яно не можа лічыцца чалавечым і справядлівым, а з'яўляецца воўчай зграяй. Права не дапускае выкарыстання дзяржаўнай улады ў карысных мэтах правіцеля. Усё гэта дае падставу разглядаць Л. І. Сапегу як прыхільніка ідэі прававой дзяржавы.

Ідэі Л. І. Сапегі замацаваны ў вядомым зводзе законаў дзяржавы – Статуце Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. Гэта новыя, характэрныя для буржуазных адносін прававыя прынцыпы: падзел улады, адзінства права для ўсёй дзяржавы і кожнага паўнапраўнага грамадзяніна, прыярытэт пісанага права. Закон рэгламентаваў дзяржаўны лад, пытанні судовай улады, правы розных катэгорый насельніцтва і інш. Ён утрымліваў нормы, якія адносіліся да ўсіх галін права, важнейшыя прававыя прынцыпы, у тым ліку прынцып суверэнітэту дзяржавы, замацоўваў і рэгламентаваў структуру і кампетэнцыі вышэйшых органаў дзяржаўнай улады ВКЛ, прычым як бы не заўважаў утварэння Рэчы Паспалітай. Як правільна адзначыла прафесар Т. І. Доўнар, Статут Вялікага Княства Літоўскага 1588 г. з'явіўся законам, арыентаваным на будучае, у пэўнай ступені – праграмай наступнага ўдасканалення дзяржаўнасці, што прадвызначыла яго выключную даўгавечнасць [1].

У канцы XVI ст. на змену Рэфармацыі прыйшла Контррэфармацыя – рэлігійна-палітычны рух, накіраваны супраць ідэй і вынікаў Рэфармацыі. Пачалося контрнаступленне каталіцызму супраць пратэстантызму.

Для прапаведавання ідэй Контррэфармацыі актыўна выкарыстоўваліся царкоўныя суды, манастырскія каталіцкія ордэны, вярхоўная, дзяржаўная ўлада каталіцкіх краін (Іспаніі, Рэчы Паспалітай), рэакцыйныя рэлігійна-палітычныя групоўкі феадалаў і шляхты. У ходзе Контррэфармацыі былі ўнесены значныя ўдакладненні ў кананічнае права, занава адрэдагаваны шэраг багаслоўскіх кніг, уведзена строгая царкоўная цэнзура, зацверджаны афіцыйны паказальнік кніг «Індэкс забароненых кніг» (спіс кніг, якія забаранялася чытаць веруючым пад пагрозай адлучэння ад царквы) [7, с. 349–355].

Асаблівасць дзейнасці езуітаў заключалася ў тым, што яны не адасабляліся ад свецкага жыцця, а наадварот, прымалі актыўны ўдзел у ім (у сферах адукацыі, культуры і інш.) і такім чынам актыўна ўплывалі на свядомасць людзей у патрэбным кірунку.

Менавіта ў гэты час на беларускіх землях у 1579 г. была адкрыта вышэйшая навучальная ўстанова – Віленская езуіцкая акадэмія (на базе езуіцкага калегіума, створанага ў 1570 г.). Гэта акадэмія ва ўсіх правах ураўноўвалася з Кракаўскім універсітэтам. Яна стала ідэйным цэнтрам Контррэфармацыі на беларускіх землях. У складзе акадэміі былі два факультэты – філасофскі і тэалагічны. На філасофскім факультэце выкладаліся ўсе гуманітарныя і прыродазнаўчыя навукі таго часу, старажытныя (грэчаская, лацінская, яўрэйская) і новыя (нямецкая, французская) мовы, а на тэалагічным факультэце – Свяшчэннае Пісанне, тэалогія, кананічнае права, казуістыка. Студэнты абодвух факультэтаў вывучалі беларускую мову.

У гэты перыяд практычна ва ўсіх гарадах Беларусі былі пабудаваны першыя езуіцкія сярэднія вучэбныя ўстановы – калегіумы. Езуіты адказаліся ад цялесных пакаранняў і суровай дысцыпліны, якія існавалі ў сярэдняй і вышэйшай школах перыяду Сярэднявечча. Яны распрацавалі шырокую сістэму пакаранняў, якія ўздзейнічалі на самалюбства вучняў (каўпак заслінымі вушамі, ганебная лава і інш.). Існавала сістэма ўзнагарод (адзнакі, пачэснае месца ў класе і інш.). Выхаванне было падпарадкавана таму, каб паставіць здольнасць вучняў на службу каталіцкай царкве.

У 1596 г. была заключана Брэсцкая унія (акт, які замацоўваў аб'яднанне каталіцкай і праваслаўнай цэркваў на тэрыторыі Рэчы Паспалітай). Гэты саюз быў праведзены на аснове ўзаемных уступак: усталёўвалася вяршэнства папы рымскага, прызнаваўся каталіцкі догмат (сыходжанне Святога Духа не толькі ад Бога-Айца, але і ад Бога-Сына) і ў той жа час захоўваліся ўсе праваслаўныя абрады, богаслужэнне і казанні праводзіліся на царкоўнаславянскай (потым на беларускай) мове.

Вакол ідэй Брэсцкай уніі разгарнулася вострая палеміка: з аднаго боку выступілі абаронцы і прыхільнікі ўніі (Пётр Скарга (1536–1612), Іпацій Пацей (1541–1613) і інш.), з другога – яе праціўнікі (Хрыстафор Філалет (? – каля 1624 г.), Мялецій Сматрыцкі (1577–1633), Афанасій Філіповіч (каля 1595–1648 гг.) і інш.).

Рэлігійны і палітычны дзеяч, ініцыятар і прапагандыст ідэй Брэсцкай уніі П. Скарга па сваіх палітычных поглядах быў прыхільнікам неабмежаванай манархіі. Ён абвінавачваў шляхту ў распаўсюджванні ідэй Рэфармацыі, крытыкаваў яе за злоўжыванне саслоўнымі прывілеямі і лічыў прадстаўнікоў гэтага сацыяльнага класа ніжэйшым саслоўем, здольным толькі на ваеннае рамяство. На яго думку, свецкая ўлада павінна падпарадкоўвацца царкоўнай, а кароль – папе рымскаму. Асветнік аб'ектыўна паказаў сацыяльную няроўнасць, якая існавала ў дзяржаве, і адным з першых прадказаў заняпад Рэчы Паспалітай.

У творы «Пра еднасць Божай царквы» П. Скарга налічыў 19 памылак праваслаўнай царквы, якія вялі да скажэння сапраўднага хрысціянскага веравызнання. Ён заклікаў князя К. В. Астрожскага, а разам

з ім і ўсе ўсходнеславянскія народы да заключэння царкоўнай уніі з Рымам. Асветнік прапанаваў шляхі пераадолення рэлігійнай варожасці, якая перашкаджала аб'яднанню цэркваў, паказаў тыя выгоды, што атрымаюць праваслаўныя хрысціяне ад гэтага духоўнага саюзу з каталікамі. Ён імкнуўся даказаць, што сапраўднае хрысціянскае веравызнанне ідзе ад рымска-каталіцкай царквы, якая мае законнае права быць галоўнай сярод усіх хрысціянскіх веравызнанняў. На думку П. Скаргі, з прыняццем рэлігійнага саюзу будуць створаны ўмовы для развіцця і росквіту сапраўднай навукі і належнай асветы для народа. Гэта прывядзе да знікнення адасобленасці і варожасці паміж праваслаўнымі і каталікамі. Праваслаўная шляхта заслужыць большы давер і атрымае магчымасць займаць значныя дзяржаўныя пасады. Дзяржава, дзякуючы царкоўнай уніі, набудзе палітычную магутнасць.

Дзяржаўны, палітычны і царкоўны дзеяч ВКЛ, арганізатар і ідэйны натхняльнік Брэсцкай уніі Іпацій Пацей у кнізе «Унія...» імкнуўся даказаць, што паміж каталіцкім і праваслаўным веравызнаннямі існуе толькі ўяўная розніца, якая склалася ў выніку прапаведніцкай дзейнасці невукаў, не дасведчаных у справах царквы і гісторыі яе развіцця. Разам з тым ён аб'ектыўна паказаў цяжкае становішча праваслаўнай царквы, неадпаведнасць яе духавенства свайму прызначэнню. Твор «Унія...» з'явіўся пасля таго, як Іпацій Пацей разам са сваім аднадумцам Кірылам Цярлецкім па дамоўленасці з каралём Рэчы Паспалітай Жыгімонтам III Вазай адносна ўмоў царкоўнай уніі накіраваўся ў Рым, дзе тайна прысягнуў папе Кліменцію VIII на вечны саюз з каталіцкай царквой. Змова стала вядомай і выклікала абурэнне праваслаўных хрысціян. Каб апраўдаць свой пераход на бок уніі, Іпацій Пацей выступіў у друку з кнігай «Унія...».

У 1597 г. Хрыстафор Філалет у адказ на кнігі Пятра Скаргі і Іпація Пацея выдаў твор «Апакрысіс», накіраваны супраць Брэсцкай уніі. Асветнік даказаў, што саюз уніяцкіх епіскапаў з рымска-каталіцкай царквой быў абумоўлены жаданнем дамагчыся матэрыяльных выгод, высокіх дзяржаўных пасад, рэлігійных прывілей і палітычных праў. Ён лічыў, што ў выніку заключэння царкоўнай уніі і абмежавання праў праваслаўнага беларускага насельніцтва можа адбыцца сялянская вайна, і падкрэсліваў, што зняважа інтарэсаў праваслаўнай апазіцыі непазбежна прывядзе да класавага антаганізму, у выніку якога рэлігійная барацьба перарасце ў сацыяльнае процідзеянне народных мас супраць феадалаў незалежна ад іх веравызнання. Каб прадухіліць уплыў працы «Апакрысіс» на народ і выратаваць царкоўную ўнію ад распаду, яе ідэолагі скуплівалі гэту кнігу і знішчалі.

Выратаванне свайго народа А. Філіповіч бачыў у адраджэнні і ўмацаванні праваслаўнай царквы. На яго думку, менавіта з-за царкоўнай уніі ў краіне беспакарана парушаюцца агульнапрынятыя законы і правы як у свецкім, так і ў духоўным жыцці грамадства. Асветнік лічыў, што польскія феадалы і прадстаўнікі каталіцкай царквы імкнуліся да ўніфікацыі праваслаўнага і каталіцкага веравызнанняў не з рэлігійных, а з палітычных меркаванняў. У палемічным зборніку «Дыярыуш» А. Філіповіч паказаў гераічную барацьбу беларускага народа за свае нацыянальныя і рэлігійныя правы, культуру, звычаі і традыцыі.

У гэты перыяд беларуская моладзь упершыню пачала атрымліваць вышэйшую юрыдычную адукацыю на Радзіме. У 1641 г. у складзе Віленскай езуіцкай акадэміі быў створаны юрыдычны факультэт, які пачаў дзейнічаць у 1644 г. Яго заснаваў сын Л. І. Сапегі К. Л. Сапега (1609–1659), падканцлер ВКЛ. Ён ахвяраваў на ўтрыманне прафесараў юрыдычнага факультэта 12,5 тыс. польскіх злотых, перадаў акадэміі бібліятэку свайго бацькі, што налічвала каля 3 тыс. каштоўных кніг, і запрасіў для выкладання на юрыдычным факультэце чатырох прафесараў-правазнаўцаў: двух немцаў (прафесара цывільнага права С. Дзільгера, прафесара кананічнага права І. Шаўэра), аднаго іспанца (прафесара цывільнага права Б. Соксо) і аднаго беларуса (ураджэнца Віцебшчыны, прафесара кананічнага права А. Алізароўскага (1618–1659)) [8]. Першым дэканам юрыдычнага факультэта стаў прафесар С. Дзільгер.

А. Алізароўскі ў працы «Аб палітычнай супольнасці людзей» прапанаваў наступную класіфікацыю права: Божае права, натуральнае права і права народаў. Пры гэтым, на думку асветніка, Божае права і натуральнае права знаходзяцца не ў падпарадкаванні другога першаму, а выступаюць як самастойныя віды і дапаўняюць адно аднаго. А. Алізароўскі пазбягаў спецыяльнага аналізу ролі і прызначэння Божага права, а калі вымушаны быў да яго звяртацца, то даваў нетрадыцыйнае тлумачэнне: «Боскае права забараняе несправядлівасць, прыгнечанне бедных і ўсялякія крыўды»[11]. Пераважна ён даследаваў натуральнае права, якое прырода закладвае ў чалавеку як сацыяльнай і біялагічнай істоце. У сацыяльным аспекце прынцыпы натуральнага права выяўляюцца праз развіццё і ўдасканаленне сацыяльнай арганізацыі жыцця людзей (сям'я, фальварак, паселішча, грамадства, дзяржава). З біялагічнага пункту гледжання правы чалавека вызначаюцца яго агульнасцю з жывёльным светам і ўвасабляюцца ў праве на самаабарону, праве на распараджэнне сабой, імкненні да супрацоўніцтва (зносін) з сабе падобнымі і інш.

Побач з прыродай у сваім вучэнні А. Алізароўскі адводзіў значнае месца розуму і рацыянальным якасцям чалавека. Прырода і розум выступаюць як

[11]Алізароўскі Аарон // Асветнікі зямлі Беларускай, Х – пачатак ХХ ст. : энцыкл. давед. / пад рэд. Г. П. Пашкова. Мінск : Беларус. энцыкл., 2001. С. 7–10.

зыходныя ўзаемадапаўняльныя перадумовы права. Абгрунтаванне натуральна-прававых ідэй дазваляла асветніку развіваць новае разуменне свабоды і роўнасці. На думку А. Алізароўскага, існуюць тры віды свабоды, а менавіта прававая, філасофская і палітычная. Прававая свабода – гэта здольнасць людзей у адпаведнасці з прыроднай і агульнай годнасцю распараджацца сваім жыццём паводле ўласнага разумення і патрабаванняў закону. Філасофская свабода – гэта ўлада розуму над эмоцыямі і імкненнямі. Палітычная свабода – гэта панаванне ў грамадстве права і закону, а не самавольства манарха.

Асветнік распрацаваў канцэпцыю грамадскага дагавору, згодна з якой прызначэнне і мэты дзяржавы суадносяцца з агульнаграмадзянскай карысцю і ўзаемазацікаўленасцю людзей у фарміраванні палітычных саюзаў – супольнасцей. Дзяржава, на думку А. Алізароўскага, з'яўляецца створаным з мноства паселішчаў аб'яднаннем людзей, звязаных правам, што ўвайшлі ў гэту згоду ў імя добрага і шчаслівага жыцця. Праблемы дзяржавы ён спалучаў з пытаннямі грамадства. Паводле тагачаснай палітычнай ідэалогіі сапраўднымі грамадзянамі былі толькі прадстаўнікі шляхты. А. Алізароўскі прытрымліваўся думкі, у адпаведнасці з якой дасканаласць дзяржавы залежыць ад найбольш рацыянальнай выбранай формы кіравання, і быў прыхільнікам спадчыннай манархіі і праціўнікам тыраніі. Асветнік лічыў, што грамадзянамі дзяржавы з'яўляюцца ўсе яе жыхары, акрамя рабоў і іншаземцаў. На яго думку, ёсць вышэйшыя і ніжэйшыя саслоўі, але для кожнага чалавека павінна існаваць магчымасць свабоднага пераходу з аднаго сацыяльнага класа ў другі і ўсе людзі роўныя перад законам. Ігнараванне прынцыпаў грамадскага дагавору вядзе да гібелі дзяржавы. Разбуральнымі фактарамі выступаюць дзеянні людзей, якія парушаюць чалавечыя сувязі, а таксама дрэннае кіраванне, адсутнасць законнасці і справядлівасці, няроўнасць, эгаізм пануючых саслоўяў, а таксама несправядлівае выкарыстанне права, асабліва ў судах.

Вялікі князь ВКЛ і кароль польскі Уладзіслаў IV Ваза (1565–1648) у сваім прывілеі пацвердзіў усе правы, дадзеныя раней акадэміі, і пажадаў, каб у ёй публічна выкладаліся курсы кананічнага і цывільнага права, а студэнтам, якія праявілі сябе ў гэтых навуках, прысуджаліся тыя ж навуковыя ступені, што і ў другіх акадэміях і ўніверсітэтах. Такім чынам, адкрыццё і дзейнасць юрыдычнага факультэта садзейнічалі эфектыўнаму прававому рэгуляванню грамадскіх адносін у ВКЛ, развіццю палітычнай і прававой думкі Беларусі ў гэты час.

З сярэдзіны XVIII ст. у развіцці беларускай дзяржаўнасці пачаўся новы этап, які характарызаваўся распаўсюджваннем на беларускіх землях асветніцкай ідэалогіі. Пад яе ўплывам у ВКЛ сталі пашырацца антыпрыгонніцкія ідэі, вырасла колькасць прыхільнікаў рэфармавання грамадства на новых буржуазна-дэмакратычных асновах. Носьбітамі прагрэсіўных ідэй з'яўляліся прадстаўнікі перадавой часткі шляхты, а таксама буржуазіі, якая толькі фарміравалася. Грамадства імкнулася да адраджэння і аднаўлення эканамічнага, палітычнага і духоўнага жыцця. Абмежавалася ўжыванне прынцыпу *liberum veto*, спрасцілася працэдура правядзення соймаў, была рэфармавана сістэма мытных пошлін. Меркавалася павелічэнне рэгулярнай арміі, упарадкаванне фінансаў і судаводства.

Я. С. Ябланоўскі (1669–1731), асветнік гэтага перыяду, крытыкаваў дзяржаўны лад Рэчы Паспалітай, слабасць каралеўскай улады, адсутнасць належнага правасуддзя, бязладдзе ў правядзенні соймаў. Аднак ён не прапаноўваў змяніць існуючы грамадскі і дзяржаўны лад, адмяніць дзеянне прынцыпу *liberum veto*.

С. Ляшчынскі (1677–1766) у працы «Вольны голас у абарону свабоды» (1733) выступіў супраць прыгоннага права. Ён патрабаваў асабістай свабоды для сялян з наданнем ім права займацца іншымі заняткамі і права складаць на памешчыкаў скаргі ў дзяржаўныя суды. На думку асветніка, рэформы павінны закрануць не толькі сацыяльную, але і палітычную сферу. Аднак С. Ляшчынскі прапанаваў толькі абмежаваць прынцып *liberum veto*.

У дзейнасці вядомага асветніка XVIII ст. С. Канарскага (1700–1763) навукоўцы вылучаюць тры асноўныя напрамкі: рэфармаванне існуючай сістэмы адукацыі, выдавецкую дзейнасць і напісанне злабадзённых палітычных твораў [3, с. 151–153]. Так, ён прапанаваў праект стварэння новай сістэмы навучання, у якой замест лацінскай мовы вялікая ўвага надавалася сучасным мовам, прыродазнаўчым і дакладным навукам, значнае месца адводзілася патрыятычнаму выхаванню. У 1740 г. была адкрыта першая школа, заснаваная па прынцыпах С. Канарскага, а ў 1754 г. была праведзена рэформа школ згодна з дадзенымі прынцыпамі. У сувязі з гэтым манаполія езуітаў у галіне адукацыі была аслаблена.

Асветнік распачаў выданне крыніц права – збор законаў «Валюміна легум». Першы том гэтай працы (С. Канарскі выступіў рэдактарам і аўтарам прадмовы) быў апублікаваны ў 1732 г. У 1732–1739 гг. выйшлі ў свет шэсць тамоў, у 1764–1780 гг. – сёмы і восьмы тамы. Яны былі перавыдадзены І. Агрызкай у Пецярбургу. У 1889 г. быў надрукаваны дзявяты том, у 1952 г. – дзясяты том.

Акрамя таго, С. Канарскі напісаў трактат «Аб эфектыўным правядзенні нарадаў», у якім выступіў супраць бессэнсоўных соймавых спрэчак. Ён прапанаваў адмяніць прынцып *liberum veto*, аднак сучаснікі не адразу прыслухаліся да яго, і гэты прынцып быў адменены толькі Канстытуцыяй Рэчы Паспалітай ад 3 мая 1791 г.

У 1780 г. беларускі асветнік М. Пачобут-Адляніцкі (1728–1810) рэарганізаваў Віленскую езуіцкую акадэмію ў Галоўную школу ВКЛ і стаў яе рэктарам. Ён прымаў удзел у дзейнасці Камісіі народнай адукацыі

(Адукацыйнай камісіі – першага міністэрства народнай адукацыі), арганізаваў ва ўніверсітэце два аддзяленні – фізічнае (факультэт логікі) і маральнае (факультэт права), адкрыў чатырохгадовую школу падрыхтоўкі настаўнікаў. У 1773 г. М. Пачобут-Адляніцкі распрацаваў праект заснавання спецыяльнага таварыства (Акадэміі навук).

Прафесар Галоўнай школы ВКЛ, член Адукацыйнай камісіі Ю. К. Багуслоўскі (1754–1819) абгрунтаваў неабходнасць канстытуцыйнай формы кіравання, крытыкаваў самадзяржаўе. У працы «Пра дасканалае заканадаўства» (1786) побач з натуральным правам як асновай справядлівага заканадаўства ён разглядаў чалавека як адзінства двух субстанцый – матэрыяльнай і духоўнай. Асветнік меркаваў, што чым больш адукаваным будзе народ, тым дасканалей будуць яго законы.

У апошняй трэці XVIII ст. сярод асветнікаў Беларусі асаблівай папулярнасцю карыстаўся фізіякратызм. Фізіякраты сапраўднай крыніцай багацця лічылі зямлю, а сапраўднай прадукцыйнай працай – земляробства. Таму яны крытыкавалі прыгоннае права, якое стрымлівала прагрэс сельскай гаспадаркі, распрацоўвалі праекты адмены прыгонніцтва, даказвалі неабходнасць фермерскага спосабу вядзення гаспадаркі. Фізіякраты прытрымліваліся тэорыі натуральнага права і дагаворнага паходжання дзяржавы.

І. Страйноўскі (1754–1815), прадстаўнік фізіякратызму, уваходзіў у склад камісіі па падрыхтоўцы праектаў грамадзянскага і крымінальнага кодэксаў. У 1799–1806 гг. ён быў рэктарам Галоўнай школы ВКЛ. Асноўнай працай асветніка лічыцца польскамоўны твор «Навука права натуральнага, палітычнага, палітычнай эканоміі і права народаў»[12]. І. Страйноўскі лічыў Бога творцам і першапрычынай прыроды. На яго думку, назіранні за нябеснымі целамі, даследаванні рознага роду стварэнняў і развагі пра будову чалавека вымушаюць прызнаваць існаванне вышэйшай сілы і мудрасці.

Асновай светапогляду І. Страйноўскага, як і ідэалогіі ўсіх тагачасных фізіякратаў, было вучэнне пра натуральны парадак рэчаў і натуральнае права як яго вынік. Натуральны парадак рэчаў – гэта адзінства фізічнага і маральнага парадку, сукупнасць законаў прыроды і грамадства. Людзі, як меркаваў асветнік, могуць быць шчаслівымі толькі праз глыбокае пазнанне і поўнае захаванне гэтага натуральнага права. Адыход чалавека або грамадства ад дакладных і разумных законаў прыроды выклікае пакаранне – няшчасці, бедствы, беспарадкі і г. д. Натуральныя ж законы выяўляюць толькі натуральныя правы і абавязкі чалавека, да якіх належыць яго імкненне да самазахавання, задавальнення сваіх патрэб у ежы, адзенні, жыллі і прыладах працы. З натуральных праў і абавязкаў асобнага індывіда І. Страйноўскі выдзяляў сацыяльныя правы і абавязкі (вечныя і нязменныя правы на асабістую свабоду, узаемную дапамогу, прыватную ўласнасць). Ён лічыў, што здабытая сумленнай працай прыватная ўласнасць – краевугольны камень грамадства, а яе недатыкальнасць з'яўляецца найпершым натуральным правам чалавека.

Паводле І. Страйноўскага, ніхто не мае права пазбавіць чалавека яго натуральнай свабоды. Ён павінен абараняць ад гвалту сваю ўласнасць і свабоду і, адпаведна, не рабіць замаху на чужую прыватную ўласнасць, не ўжываць сілы ў адносінах да іншых людзей, за выключэннем выпадкаў самаабароны. Прынцыпы натуральнага права асветнік разглядаў у якасці крытэрыяў сапраўднасці або няправільнасці таго ці іншага сацыяльна-палітычнага ладу.

І. Страйноўскі паслядоўна абгрунтаваў залежнасць шчасця народа і разумнае сацыяльнае ўпарадкаванне ад узроўню пашырэння ведаў аб прыродзе і грамадстве. На яго думку, для ажыццяўлення плана асветы насельніцтва неабходна стварыць правільную сістэму навучання юнацтва, садзейнічаць развіццю навукі, выдаваць кнігі і падручнікі.

І. І. Ю. Храптовіч (1729–1812), грамадскі, палітычны і дзяржаўны дзеяч ВКЛ, прыхільнік фізіякратызму, з'яўляўся адным са стваральнікаў Адукацыйнай камісіі і больш за 20 гадоў быў яе членам. Найбольш поўнае ўяўленне пра светапогляд асветніка даюць яго творы «Аб штогадовым нацыянальным узнаўленні» і «Аб натуральным праве» [9]. І. І. Ю. Храптовіч звярнуў увагу на наяўнасць у грамадстве натуральнага парадку, які ўстанаўлівае правы і абавязкі ўсіх людзей. Для падтрымкі такога парадку ў супольным жыцці заключаюцца дагаворы. Чым бліжэй закон да натуральнага права, тым больш ён справядлівы. У цэнтры знаходзіцца чалавек з яго патрэбамі, інтарэсамі, правамі і абавязкамі. Паколькі задавальненне гэтых патрэб магчыма толькі ў грамадстве, то кожнаму чалавеку трэба лічыцца з патрэбамі іншых яго членаў. Але людзі значна адрозніваюцца адзін ад аднаго сваім маёмасным становішчам. Як вынікае з натуральнага парадку рэчаў, усе грамадзяне павінны працаваць на тым месцы, якое ім натуральна наканавана, не імкнучыся пранікнуць у закрытую для іх сферу.

Прагрэсіўным момантам у вучэнні І. І. Ю. Храптовіча з'яўлялася тое, што маральны парадак ён ставіў у залежнасць ад фізічнага парадку прыроды. Маральныя законы, на думку асветніка, цалкам адпавядаюць таму, што карысна і неабходна чалавеку ў яго жыцці. Як і ўсе фізіякраты, ён разглядаў грамадства як натуральны арганізм, што складае частку прыроды, у якую ўваходзяць чалавек і яго маральныя прынцыпы. Калі чалавек не мае свабоды ці бяспекі

[12]Страйноўскі Іеранім // Асветнікі зямлі Беларускай, X – пачатак XX ст. : энцыкл. давед. / пад рэд. Г. П. Пашкова. Мінск : Беларус. энцыкл., 2001. С. 416–418.

або пазбаўлены ўласнасці, ён становіцца ізгоем, бескарысным для сябе і грамадства. І. І. Ю. Храптовіч лічыў чалавека і яго здольнасці (перш за ўсе разумовыя) галоўным элементам вытворчасці. У правядзенні гаспадарчых рэформ і вызваленні сялян ад прыгоннай залежнасці асветнік бачыў шляхі ўзнаўлення грамадства. Ён верыў, што пры належнай арганізацыі грамадскага жыцця ў адпаведнасці з патрабаваннямі натуральнага права ўзнікае магчымасць стварэння пастаянна растучай зябяспечанасці і павышэння ўзроўню асветы для ўсіх. Гэта быў асветніцкі гуманізм і адначасова ўтапізм. Гуманізм І. І. Ю. Храптовіча праяўляўся ў павазе да творчасці народа, асобы селяніна, прызнанні яго натуральных праў.

Палітычны і грамадскі дзеяч ВКЛ, беларускі асветнік А. Тызенгауз (1733–1785) быў фізіякратам-практыкам. Ідэі рэфармавання дзяржаўнага ладу, перадавыя, гуманістычныя ідэі грамадства выказвалі таксама К. Нарбут, С. М. Аскерка і інш.

Нельга не сказаць пра ідэі ўтапічнага сацыялізму, якія па свайму зместу ў некаторай ступені былі прагрэсіўнымі. У рукапісным творы І. М. Яленскага (1756–1813) «Благавесцьда Ісраіля Расійскага» выкладзена праграма радыкальнай перабудовы грамадства. Яна заключалася ў адмене прыватнай уласнасці, саслоўнага ладу, стварэнні агульнанароднай дзяржавы і ўрада, абшчынным вядзенні гаспадаркі, усеагульнай абавязковай працы і адукацыі, справядлівым падзеле матэрыяльных багаццяў. На думку асветніка, органы дзяржаўнага кіравання, суды і раду старэйшын трэба выбіраць агульнанародным галасаваннем. Перавага павінна аддавацца мудрым і дабрадзейным людзям, бедным па свайму матэрыяльнаму становішчу. І. М. Яленскі выступаў за ўвядзенне простых і ясных законаў, адмену смяротнага пакарання і яго замену выгнаннем парушальнікаў законаў з грамадства.

С. Зяновіч у рукапіснай працы «Сапраўднае тлумачэнне праў чалавека» крытыкаваў існуючае несправядлівае грамадства. Асветнік асуджаў сацыяльную няроўнасць, прыгнечанне аднаго чалавека другім, самадзяржаўе як форму дзяржаўнага кіравання. Сучаснаму недасканаламу грамадству ён проціпаставіў ідэал свабоднага грамадства, заснаванага на агульнай уласнасці і роўнасці людзей.

П. К. Бжастоўскі (1739–1827) у сваім маёнтку нагогул скасаваў прыгоннае права, дараваў сялянам асабістую вольнасць і перадаў усю зямлю сялянскай абшчыне, якая атрымала назву «Паўлаўская рэспубліка». Яна мела ўласныя сцяг, герб, войска, грошы, прэзідэнта. Паўлаўская рэспубліка спыніла сваё існаванне пасля смерці П. К. Бжастоўскага.

## Заключэнне

Палітычныя і прававыя ідэі, якія выказваліся айчыннымі асветнікамі на працягу XII–XVIII стст., адлюстроўвалі інтарэсы розных сацыяльных класаў і груп беларускага насельніцтва. Грамадскае значэнне набывалі тыя ідэі, якія адпавядалі інтарэсам вялікай часткі грамадства, найбольш змястоўна адлюстроўвалі адносіны розных людзей да дзяржавы, права, палітыкі, заканадаўства.

У сваіх працах айчынныя асветнікі паказвалі самыя істотныя сацыяльныя і палітычныя праблемы сучаснага ім грамадства, выступалі за стварэнне самастойнай і незалежнай дзяржавы, уздымалі праблему ўдасканалення дзяржаўных, прававых інстытутаў, а таксама адзначалі неабходнасць захавання і вывучэння гістарычнай спадчыны беларускага народа з мэтай недапушчэння памылак у будучым.

Прагрэсіўныя напрацоўкі, якія былі зроблены айчыннымі асветнікамі з XII па XVIII ст., аказалі значны ўплыў на далейшае станаўленне і эвалюцыю дзяржаўных, прававых інстытутаў Беларусі і былі выкарыстаны на наступных этапах развіцця нацыянальнай дзяржаўнасці.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Доўнар ТІ. *Гісторыя дзяржавы і права Беларусі*. 2-е выданне. Мінск: Адукацыя і выхаванне; 2021. 432 с.
2. Юхо ИА. *Общественно-политический строй и право Белоруссии в XVI веке* [диссертация]. Киев: Киевский университет; 1979. 401 с.
3. Шалькевіч ВФ. *Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі*. Мінск: Маладзёжнае навуковае супольніцтва; 2002. 248 с.
4. Вішнеўская ІУ. *Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі*. Мінск: Тэсей; 2004. 271 с.
5. Голубева ЛЛ. Асноўныя этапы станаўлення і развіцця палітычнай і прававой думкі Беларусі. У: Балашэнка СА, рэдактар. *Гісторыя і сучаснасць: беларуская дзяржаўнасць ва ўсходнееўрапейскім цывілізацыйным кантэксце*. Мінск: Бизнесофсет; 2012. с. 179–189.
6. Сокол СФ. *Политическая и правовая мысль в Белоруссии XVI – первой половины XVII в*. Минск: Наука и техника; 1984. 186 с.
7. Гризингер Т. *Иезуиты. Полная история их явных и тайных деяний от основания ордена до настоящего времени*. Костелецкая АП, редактор. Минск: МФЦП; 2004. 640 с. (Народы земли).
8. Голубева ЛЛ. Алізароўскі Аарон (Адам, Аляксандр) (1618–1659). *Юстиция Беларуси*. 2003;5:11.
9. Голубева ЛЛ. Іахім Літавор Храптовіч – дзяржаўны, грамадскі дзеяч, фізіякрат, маршалак Галоўнага Суда, міністар замежных спраў, апошні канцлер Вялікага Княства Літоўскага. *Юстиция Беларуси*. 2015;1:77–79.

## References

1. Downar TI. *Gistoryja dzjarzhavy i prava Belarusi* [History of the state and law of Belarus]. 2nd edition. Minsk: Adukacyja i vyhavanne; 2021. 432 p. Belarusian.

2. Yuho IA. *Obshhestvenno-politicheskii stroi i pravo Belorussii v XVI veke* [Socio and political system and law of Belarus in the 16th century] [dissertation]. Kyiv: Kievskii universitet; 1979. 401 p. Russian.

3. Shalkevich VF. *Gistoryja palitychnaj i pravavoj dumki Belarusi* [History of political and legal thought of Belarus]. Minsk: Maladzjozhnae navukovae supol'nictva; 2002. 248 p. Belarusian.

4. Vishnewskaja IU. *Gistoryja palitychnaj i pravavoj dumki Belarusi* [History of political and legal thought of Belarus]. Minsk: Tjesej; 2004. 271 p. Belarusian.

5. Golubeva LL. Key stages in the development of political and legal thought in Belarus. In: Balashjenka SA, editor. *Gistoryja i suchasnasc': belaruskaja dzjarzhawnasc' va wshodneewrapejskim cyvilizacyjnym kantjeksce* [History and the present: Belarusian statehood in the Eastern European civilisational context]. Minsk: Biznesofset; 2012. p. 179–189. Belarusian.

6. Sokol SF. *Politicheskaya i pravovaya mysl' v Belorussii XVI – pervoi poloviny XVII v.* [Political and legal thought in Belarus of the 16th – first half of the 17th century]. Minsk: Nauka i tehnika; 1984. 186 p. Russian.

7. Griesinger T. *Iezuity. Polnaya istoriya ih yavnyh i tainyh deyanii ot osnovaniya ordena do nastoyashhego vremeni* [The Jesuits. A complete history of their overt and secret deeds from the foundation of the order to the present time]. Kosteletskaya AP, editor. Minsk: MFTsP; 2004. 640 p. (Narody zemli). Russian.

8. Golubeva LL. [Alizarovsky Aharon (Adam, Alexander) (1618–1659)]. *Justice of Belarus*. 2003;5:11. Belarusian.

9. Golubeva LL. [Joachim Litavor Khraptovich – statesman, public figure, physiocrat, marshal of the Supreme Court, minister of foreign affairs, last chancellor of the Grand Duchy of Lithuania]. *Justice of Belarus*. 2015;1:77–79. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 14.11.2023.*
*Received by editorial board 14.11.2023.*